Наша доля

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ ШТОТЫДНЁВАЯ ГАЗЕТА

Выдаецца з верасня 1990 г.

N9 (170)
2 сакавіка 1995 г.
кошт у розніцу -- 200 руб.

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні дапаўнення ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях»

З мэтай удасканалення прававога рэгулявання дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь пастанаўляе:

1. Дапоўніць артыкул 9 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях», прынятага 4 кастрычніка 1994 года (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1994 г., N 29, арт. 503), часткай трэцяй наступнага зместу:

«У выпадках, прадугледжаных статутам грамадскага аб'яднання, яго членамі могуць з'яўляцца юрыдычныя асобы, якія дзейнічаюць праз сваіх прадстаўнікоў. Прадстаўнікі юрыдычнай асобы прымаюць удзел у рабоце грамадскага аб'яднання на падставе службовых паўнамоцтваў або даверанасці».

2. Увесці гэты Закон у дзеянне з дня яго апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.ЛУКАШЭНКА

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аб узнагароджанні ўдзельнікаў і арганізатараў супермарафона на інвалідных калясках Санкт-Пецярбург - Алматы Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

За актыўны ўдзел у супермарафоне на інвалідных калясках Санкт-Пецярбург - Алматы, важкі ўклад у развіццё спартыўнага руху сярод інвалідаў узнагародзіць Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь:

Дзенісевіча Паўла Генадзьевіча - інваліда 1 группы.

Дрыгу Анатоля Аляксандравіча - намесніка старшыні Цэнтральнага праўлення Беларускага таварыства інвалідаў.

Кацегава Івана Аркадзьевіча - інваліда 1 групы.

Кручкова Міхаіла Карпавіча - намесніка загадчыка аддзела сацыяльнага забеспячэння Гомельскага аблвыканкама.

Лемутава Ігара Леанідавіча - інваліда 1 групы.

Румянцава Валерыя Іванавіча - інваліда 1 групы.

Шпаро Дзмітрыя Ігаравіча - дырэктара клуба «Прыгода», г.Масква.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.ГРЫБ

16 лютага 1995 г., г.Мінск. N 3589-XII

Аб індэксе спажывецкіх цэн за студзень 1995 года

Міністэрства статыстыкі і аналізу паведамляе, што ў студзені 1995 года ў параўнанні са снежнем 1994 года індэкс спажывецкіх цэн склаў 139,2 працэнта.

Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь

Каментарый да паведамлення Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь аб індэксе спажывецкіх цэн за студзень 1995г.

У сувязі з апублікаваннем індэкса спажывецкіх цэн за студзень 1995 года Міністэрства працы Рэспублікі Беларусь растлумачвае.

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб індэксацыі даходаў насельніцтва з улікам інфляцыі» і на падставе пастановы Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 1995 г. N 7 «Аб павышэнні памеру мінімальнай заработнай платы і матэрыяльнай падтрымцы асобных катэгорый грамадзян» індэксацыя грашовых даходаў за студзень бягучага года, атрымліваемых насельніцтвам з бюджэтных крыніц, праведзена ў выглядзе аднаразовага перагляду памераў аплаты працы, сацыяльных пенсій, дапамог, стыпендый, грашовага забеспячэння.

Насельніцтву, якое атрымлівае даходы з іншых крыніц, кампенсацыя страт ад інфляцыі праводзіцца па падставах, прадугледжаных калектыўнымі дагаворамі (пагадненнямі).

Міністэрства працы Рэспублікі Беларусь

ДОМ ЛЯ ДАРОГІ

Зусім не суб'ектыўныя заметкі пра сённяшняе жыццё-быццё ў інтэрнатах для дзяцей з фізічнымі недахопамі

Калі ўязджаеш у Івянец з боку Мінска, па левым боку шашы нельга не заўважыць прыгожы двухпавярховы будынак з чырвонай цэглы. У ім знаходзіцца Івянецкі дом-інтэрнат для дзяцей з фізічнымі недахопамі, у асноўным з дыягназам дзіцячы цэрэбральны параліч. Тут, на поўным дзяржаўным забеспячэнні, выхоўваюцца каля 200 дзяцей.

Давайце зазірнем у галоўны будынак інтэрната, дзе вучацца, лечацца і праводзяць свой вольны час выхаванцы. У холах --утульна, прасторна. На кожным паверсе - каляровы тэлевізар, на сценах -- фоташпалеры,кветкі, у памяшканнях, што вельмі значна ў наш цяжкі час, - цёпла. Два гады спатрэбілася на тое, каб у канцы мінулага года кацельня пачала працаваць на прыродным газе — гэта вынік клопатаў дырэктара інтэрната Ф.Л.Гольдшмідта.Калі ён 28 гадоў таму назад пачынаў тут працаваць, гэтая ўстанова называлася Івянецкі дзіцячы дом інвалідаў. Ён прапанаваў Міністэрству сацзабеспячэння ў назве дзіцячага дома слова «інвалідаў» замяніць іншым, каб не напамінаць хвораму дзіцяці, з якім прырода абышлася жорстка, аб яго хваробе, а накіраваць усе намаганні на падрыхтоўку яго да паўнацэннага жыцця і працы.

Сёння гэтая ўстанова называецца Івянецкі дзіцячы дом-інтэрнат. Але справа не ў назве ці замене адной шыльды на другую. Ужо адным гэтым актам мелася на ўвазе не акцэнтаваць увагі на недахопы дзіцяці, а, наадварот, зрабіць гэты недахоп менш балючым, развіць яго здольнасці ў пэўным накірунку, кампенсаваць фізічны недахоп інтэлектуальнай і працоўнай падрыхтоўкай.

Дзіця рыхтавалі да самастойнага жыцця. Працягваўся працэс, як гэта стала модным гаварыць, рэабілітацыі. Тады пра гэта іншаземнае слова мала хто чуў. Але справа не ў слове, а ў самой справе. А справы у тыя 60-70 гады мелі свае пэўныя поспехі. Я магу так сцвярджаць, таму што сам пасля перанесенай хваробы стаў інвалідам другой групы і выхоўваўся ў гэтым інтэрнаце з самага пачатку яго заснавання. Тут закончыў 10 класаў. Пасля вучобы ў Мінскім інстытуце замежных моў вярнуўся ў інтэрнат і вось ужо 18 гадоў працую тут настаўнікам замежнай мовы. Такім чынам, усе этапы развіцця інтэрната праходзілі на маіх вачах. Большасць маіх аднакласнікаў знайшлі свой шлях у жыцці, актыўна ўдзельнічаюць у працы, нягледзячы на фізічныя недахопы.

У той час дзіцячы дом знаходзіўся ў драўляных доміках былога лясгаса. Кожны год праводзілі капітальны рамонт, рабілі прыбудовы. Што ні год - спраўлялі наваселле. Дзеці пачалі жыць у памяшканнях з усімі выгодамі. З'явіліся добра абсталяваныя вучэбныя кабінеты. Да нас пачалі ездзіць настаўнікі і іншыя спецыялісты пераймаць вопыт.





Час ідзе, і ён заўсёды ўносіць свае карэктывы. Паўстала пытанне аб пабудове новага, больш сучаснага памяшкання для інтэрната. Нарэшце ўзняўся новы будынак. Здавалася б, чаго ж больш, жыві ды радуйся. Але калектыў заўсёды ў пошуку, і ён знаходзіць тыя шляхі, каб палепшыць умовы жыцця выхаванцаў. Новы будынак інтэрната быў злучаны пераходам са старым памяшканнем.

У апошнія гады ўдасканалены і створаны новыя вучэбныя кабінеты: музыкі і спеваў, хіміі і біялогіі, фізікі і матэматыкі, беларускай мовы, лінгафонны кабінет і камп'ютэрны клас і інш. У школе вучні спасцігаюць асновы радыётэхнікі, асвойваюць машынапісную справу. Дзейнічае ўнутрышкольнае тэлебачанне. Цікава зазірнуць таксама ў майстэрні — тут заўсёды кіпіць праца. Ёсць і сапраўдныя творы мастацтва, і гэта адзначаюць шматлікія наведвальнікі: разьба па дрэву, сталярныя вырабы, інкрустацыя, мазаіка са шпона, выпальванне, швейныя вырабы, вязанне, макрамэ, мастацкая вышыўка, кераміка... Хіба пералічыш усё. А ствараюць гэтыя вырабы вельмі хворыя дзеці. Нялёгка даецца ім гэты занятак, нялёгка працаваць з імі і настаўнікам. Тое, чаму навучыліся нашыя выхаванцы ў школе, стала сродкам далейшага іх існавання. Так, напрыклад, А.Клемантовіч працуе ў адным са швейных атэлье г.Мінска. Дарэчы, зусім нядаўна яна выйшла замуж за нашага выхаванца. Запрашала сваіх настаўнікаў на вяселле. Н.Бацяноўская працуе на швейнай фабрыцы ў г.Жодзіна. Бабруйскае швейнае вучылішча закончыла Адамовіч І., якая працуе на камбінаце бытавога абслугоўвання. Пералік можна працягваць.

Шмат сувеніраў знайшлі сваё месца ў некаторых дамах за мяжой. Нашыя выхаванцы падарылі іх замежным гасцям у час іх візіту ў інтэрнат, а таксама ў час знаходжання нашых выхаванцаў на аздараўленні ў Германіі і Чэхаславакіі. Дарэчы, з Германіяй у нас склаліся добрыя, сяброўскія адносіны, напрыклад, з зямлёй Райнланд Пфальц. Шмат разоў немцы былі ў нас у гасцях. Яны стараюцца па меры сваіх сіл і магчымасцей дапамагчы нам. Разамз медыкаментамі і харчовымі таварамі яны прывозяць інвалідныя каляскі, якіх так не хапае.

А вось Марцін Бэндар з горада Майнца падарыў інтэрнату аўтобус «Мэрсэдэс», які па яго жініцыятыве быў пераабсталяваны там жа ў Германіі для перавозу дзяцей у інвалідных калясках, а таксама спадарожнікавую антэну. Прыемна атрымліваць не толькі падарункі, але не менш да спадобы тая ўвага, з якой ставяцца да нас замежныя сябры.

У верасні мінулага года нашы нямецкія госці пасадзілі ў інтэрнаце дрэва дружбы - каштан.

А як не сказаць пра вольны час выхаванцаў. Да паслуг дзяцей —атракцыёны, більярдная, памяшканні для гульняў, цудоўны відэазал, спартзал, стадыён. У прасторнай чытальнай зале бібліятэкі можна прачытаць цікавую кнігу, зазірнуць у газету ці часопіс.

Разам з выхавальнікамі дзеці робяць экскурсіі ў свой гісторыка-краязнаўчы музей, які існуе ўжо больш 10 гадоў. У музеі 9 залаў, кожны з якіх прысвечаны адной якой-небудзь тэме: Вялікай Айчыннай вайне, партызанскаму руху на тэрыторыі раёна, сялянскаму быту, флоры і фауне і г.д. Тут сабрана звыш 3000 экспанатаў, і кожны экспанат - гэта сведка далёкай мінуўшчыны. Нездарма музею прысвоена званне «народны».

Навучанне ў інтэрнаце ажыццяўляецца паралельна з лячэннем. Тут створаны і дзейнічаюць утульныя медыцынскія кабінеты масажа, лячэбнай фізкультуры, фізіятэрапіі і лагапедыі, трэнажорны і механатэрапіі, гальванічны, водалячэбніца. Ёсць і свой басейн. Што тычыцца медыцынскай службы, то хацелася б сказаць аб урачах. Шмат іх змянілася за часы існавання інтэрната. Студэнты-медыкі, а пасля ўжо і маладыя спецыялісты не падрыхтаваны да працы ва ўстановах падобнага тыпу.

У свой час адпаведнаму міністэрству было прапанована стварыць пры медыцынскім інстытуце спецыяльную групу, дзе б студэнты знаёміліся са спецыфікай работы ў такіх установах. Але пытанне не вырашана і па сённяшні дзень.

Урачы, якія прыходзілі да нас працаваць, па розных прычынах пакідалі інтэрнат. Але ж дзяцей лячыць патрэбна, таму калектыў — у пошуках новага, больш сучаснага. Вось і зусім нядаўна дырэктар інтэрната пабываў у службовай камандзіроўцы ў Галандыі, у г.Арнхайме. У дзіцячым рэабілітацыйным цэнтры «Гроот Клімендаль» на працягу двух тыдняў ён знаёміўся з вопытам галандскіх калег па лячэнню, навучанню і выхаванню хворых дзяцей з дыягназам дзіцячы цэрэбральны параліч. А там было чаму пазайздросціць. Ну, напрыклад, у гэтай установе знаходзіцца 550 дзяцей-інвалідаў. Раніцой іх прывозяць, а вечарам адвозяць з цэнтра дадому. Для гэтых паездак задзейнічаны шматлікі транспарт. Расходы аплочвае дзяржава. Нягледзячы на тое, што дзеці хворыя і рухацца ім цяжка, не ўбачыш ні мыліцы, ні палкі. Дзеці карыстаюцца інваліднымі каляскамі, якімі спраўна кіруюць. Кабінеты насычаны шматлікай сучаснай тэхнікай. Менавіта на выкарыстанні тэхнікі і ўсялякіх прыстасаванняў, аудыявізуальных сродкаў сканцэнтравана ўвага ў навучальным і лячэбным рэабілітацыйным працэсе. Максімум увагі надаецца развіццю самастойнасці, самаабслугоўванню.

Канешне, па тэхнічнаму абсталяванню нам далёка да Галандыі. Але сёе-тое ёсць і ў нас у інтэрнаце, зразумела, хацелася б большага. І дзіцячыя погляды скіраваны на дарослых. Дык не падманем жа гэтых спадзяванняў.

Г.ЛАПУЦКІ,
настаўнік замежнай мовы дзіцячага дома-інтэрната, інвалід 2-й групы з дзяцінства, Валожынскі р-н

БЛАГИМИ НАМЕРЕНИЯМИ...

ДУШЕВНАЯ АМНЕЗИЯ

Всегда ли «глас народа» - глас истины?

У каждого человека есть свой звездный час, когда исполняются его мечты, удается то, что раньше давалось с трудом, когда обнаруживаешь в себе способности, о которых и не подозревал. В общем, размеренное течение жизни вдруг убыстряется, все воспринимается острее обычного и человек чувствует, что реализует себя на полную катушку, а не по крупицам, как раньше. У единиц из миллионов это происходит неожиданно, по формуле «проснулся - и увидел себя знаменитым», у подавляющего большинства звездный час — награда за кропотливую, каждодневную, незаметную работу мысли и души.

Звездный час Марии Прохоровны Гутник наступил в начале 1989 года и продолжался пять лет. До этого она, инвалид с детства, училась, работала экономистом, ушла на пенсию, приобретала друзей, пыталась наладить личную жизнь. Были свои радости и огорчения на этом пути длиною более полувека, но обычные, касающиеся лично ее; были успехи и промахи, связанные с профессией, но тоже не выходящие из ряда вон. Когда 22 декабря 1988 года ее, довольно-таки случайно попавшую на первое заседание только что образованного Октябрьского райотдела БелОИ, избрали неожиданно председателем общества инвалидов одного из районов столицы, она это тоже восприняла как обычный эпизод своей биографии. Но очень скоро поняла, что, если хочет исполнять эту свою новую обязанность по-честному, должна проявить недюжинные изобретательность, упорство и активность.

Райотдел как таковой числился лишь по бумагам. На самом деле на руках у Марии Прохоровны были списки инвалидов района - и все. Ни помещения, где им можно собираться, ни планов, что нужно им делать в первую очередь и что потом, ни даже номеров телефонов этой трехтысячной массы людей, из которых она не знала никого.

Она взяла справочник Минской городской телефонной сети и позвонила его составителям с сумасшедшей просьбой — дать номера телефонов тех из трех тысяч инвалидов, кто их имеет. Ей не отказали, хотя вполне могли бы. Ей вообще везло на добрых и понимающих людей, а может, она просто умела у всех официальных лиц, с которыми общалась, пробудить доброту и понимание. Как бы там ни было, 300 номеров телефонов она выписала и несколько дней подряд с утра до вечера звонила, приглашая инвалидов на собрание в свой маленький домик - больше было некуда.

Потом «выбила» у исполкома небольшое помещение по улице Воронянского для своего райотдела и тут же, понимая, что только что завоеванную благосклонность начальства по отношению к инвалидам упускать нельзя, потребовала участок земли для строительства реабилитационного центра. Чтобы получить землю и начать строительство, нужно было собрать 15 подписей и сделать 9 заявок на обеспечение будущего здания коммуникациями. Для этого требовалось не просто ходить и убеждать десятки разных по характеру и своему отношению к инвалидам людей. Приходилось быть и экономистом, и технарем, и архитектором, но более всего, конечно, дипломатом. Скажем, энергетики отказали в заявке провести к предполагаемому реабилитационному центру теплосети. Горисполком согласился с энергетиками поговорить и убедить тех помочь инвалидам, но с условием, что БелОИ примет долевое участие в работах, то есть внесет 3,5 миллиона рублей (по тем временам деньги огромные). И только после разговора Гутник с руководством Белглавэнерго эту «дань» с инвалидов решили не брать.

«Минскпроект» потребовал 14 миллионов за архитектурное обеспечение строительства. Тогдашнее руководство БелОИ решило, что это - дорого, и начатый уже проект был прерван, так сказать, на полуслове. Через несколько лет за продолжение работы над ним общество заплатило 88 миллионов. Между прочим, руководил проектом один и тот же архитектор.

А еще пришлось искать спонсоров, которые норовили поставить непременным условием своей помощи выделение их организациям квартир в жилом доме для инвалидов. Конечно, этими переговорами занимались и представители ЦП, но Гутник, как инициатор строительства, непременно в этом участвовала. Тем более, что среди способностей, проявившихся у Марии Прохоровны на новом поприще, было и редкое умение находить спонсоров. Столько помощников не имел ни один райотдел БелОИ в столице. Например, предприятие «Пластика» перечисляло инвалидам Октябрьского района деньги ежемесячно на протяжении ряда лет: сначала по нескольку сотен рублей, а с ростом цен -по 3 миллиона. Спонсоры прекратили эту помощь только тогда, когда с суммы этих пожертвований у них взяли налоги, то есть из-за обиды на несовершенное налоговое законодательство. Администрация другого предприятия - «Талан» пыталась отговориться от настойчивого председателя райотдела БелОИ тем, что помогает только конкретным инвалидам. Тогда Гутник дала им конкретный адрес: купите пишущую машинку девочке-инвалиду Лене Федоренчик, она пишет хорошие стихи, держа карандаш в зубах. Дирекции «Талана» ничего не оставалось делать, кроме как сдержать свое слово и помочь.

Эта одинокая, живущая в скромном деревянном домике женщина, став вожаком трех тысяч обделенных судьбою людей, добывала для них квартиры, коляски, телевизоры, холодильники. Ее знали в горсобесе и райисполкоме, на предприятиях района и в комиссиях ВТЭК как постоянного, упрямого, просящего только за других посетителя. Добилась, чтобы пять инвалидов переселились из развалюх или тесных комнатушек в благоустроенные квартиры в доме для ветеранов по улице Рокоссовского. Обычно, после получения от ВТЭК справки, что инвалид нуждается в коляске, он может ждать средство передвижения до семи лет, у Гутник инвалиды получали коляски за месяц-два. Чтобы так переместиться в очереди, нужны веские основания, акты, что человек остро нуждается в этом. Гутник и акты составляла, и горсобес убеждала сделать ее протеже первоочередниками.

Больше всего гордится, что смогла во многом решить в своем районе важнейшую для инвалидов проблему трудоустройства. Организовала предприятие «Инрем», за время существования которого,по ее утверждению, ни одному инвалиду не было отказано в приеме на работу. «Инрем» занимался ремонтом помещений, но чтобы найти дело тем, кто никак не мог быть полезен на этих работах, Гутник объездила воинские части, буквально выклянчила там списанные костюмы и наладила производство из этого материала рукавиц.

Она может назвать едва ли не сотни людей, которым оказала конкретную помощь: Римме Анатольевне Пекарской квартиру помогла получить, Зинаиде Демьяновне Агибаловой - инвалидную коляску вне очереди, по просьбе Надежды Мироненко добилась, чтобы в их многоэтажном доме лифт отремонтировали. Очень долго можно множить этот список. Но случилось то, чего не могла ожидать ни Гутник, ни руководство БелОИ, которое много лет подряд на каждом заседании и почти по каждому поводу ставило ее в пример как лучшую из председателей райотделов общества в столице, — в конце прошлого года на районной конференции Марию Прохоровну не избирают в новый состав правления, то есть лишают поста. При этом присутствуют председатель городского правления БелОИ В.П.Потапенко, пусть не все, но многие из инвалидов, которым Гутник помогала в свое время. Не вступился никто.

У самой Марии Прохоровны своя версия происшедшего. Согласно ей, все сводится к козням, которые затеяли против нее штатные работники райотдела БелОИ - бухгалтер, библиотекарь. Они позвали на конференцию своих сторонников, не послали пригласительные билеты многим делегатам, в итоге сорвали ее отчетный доклад и, пользуясь шумной, нервной обстановкой собрания, избрали в правление кого хотели.

У председателя Минского городского правления БелОИ В.П.Потапенко иная точка зрения:

— Все правильно, — подытоживает он. — Мария Прохоровна работала честно, сделала для инвалидов много хорошего. Но со временем стала проявлять нетерпимость, принимать единоличные решения, не смогла найти контакта со своими работниками и активом. Люди ее переизбрали.

Допускаю, что это так. Для ее, одинокой женщины, инвалиды района заменили семью. Она ведь и помогала им по-семейному, как близким людям. И, чего греха таить, большей частью в одиночку помогала, потому что не нашлось в райотделе человека, который в этом мог бы ее заменить. А раз так, считала справедливым и естественным быть полноправным главою своей трехтысячной семьи. В чем-то ошибалась, действовала по своему вкусу. Таких, мелких, оплошностей комиссия контрольно-ревизионного управления «раскопала» немало: новый, выписанный на райотдел, телевизор отдала инвалиду, а его телевизор, похуже, поставила в райотделе; посчитала удобным сделать для шофера рабочий день ненормированным, но не позаботилась, чтобы это было оформлено документально; чтобы увеличить заработок своим низкооплачиваемым сотрудникам, делила деньги из фонда зарплаты поровну. Нарушения? Безусловно, но не корыстного плана, не ради личного обогащения, скорее, наоборот. Из тех нарушений, которых достаточно, чтобы упрекать, но недостаточно, чтобы осудить по закону. Что, в общем, проверка и подтверждает.

Говорят, глас народа - глас Божий. Не берусь судить, насколько справедливы итоги голосования. И ни в коей мере не утверждаю, что новый избранный председатель Октябрьского райотдела бывший главный бухгалтер МГП БелОИ Светлана Егоровна Толстунова в чем-то ущербна — время покажет. Но что уж совсем отказываюсь понять и тем более оправдать - это ту легкость, с которой человека, пять лет вкладывавшего в инвалидное движение свою душу, отстранили от дел — после многолетних славословий и панегириков в ее адрес, после бесчисленных наград за ее самоотверженный труд на этом поприще. Когда, обидевшись, она написала заявление о своем выходе из БелОИ, инструктор в Центральном правлении общества отдала ей учетную карточку - и все. Спрашиваю, как отреагировали на то, что вы покинули Белорусское общество инвалидов, его председатель, члены президиума? Отвечает: «Они даже не знают об этом».

Существуют память разума и память души. Страшно потерять память вообще. Такому сочувствуют, такого жалеют. Потерять память о сделанном тебе добре, заболеть душевной амнезией не считается страшным. Иногда это даже удобно, потому что не нужно тогда отплачивать за добро.

К сожалению, душевная амнезия — болезнь для нас хроническая. Случай с Гутник — только частное проявление этого всеобщего заболевания. Сколько раз мы всенародно поливали грязью и изображали закоренелыми негодяями всех, кто стоял у руля государства и кому в свое время пели всенародно же дифирамбы. Иной участи ни один наш лидер, начиная с 1917 года, не удостаивался. Но если все они были такие плохие, чего же мы сами тогда стоим? Не из одних злодейств состоит наша история, были в ней и добрые дела, да только говорить о них нынче непрестижно, немодно.

Если вернуться к Марии Прохоровне Гутник, то все много лет сходились на том, что она — специалист своего дела. Специалист, кстати, редкий — быть хорошим организатором инвалидного движения весьма непросто. Таких можно по пальцам пересчитать. Этой специальности нигде не учат, и даже большие знания приобрести ее не помогут, нужен особый душевный потенциал и любовь к этому делу. Думаю, что руководство БелОИ знает все это во много раз лучше, чем я. Зачем же терять такого специалиста, пусть себе и переизбранного? Не уверен, что в обществе инвалидов изобилие людей с организаторским даром. Неужели для М.П.Гутник в обществе не нашлось бы дела? Получается, что не только дела для нее нет,но даже и доброго слова на прощание. Сомневаюсь, что всегда, при всех обстоятельствах подпевать гласу народа, больного душевной амнезией, — лучший из выходов.

Борис САФРОНЕНКО

ВОЗВРАЩАЯСЬ К НАПЕЧАТАННОМУ

Уступите место инвалиду

Погода была отвратительной: шел дождь со снегом, дул пронизывающий ветер. Мы, группа инвалидов войны, вышедшая из 13-й городской поликлиники, ждали трамвая со стороны Зеленого Луга. Однако его долго не было. Все это время, прижимаясь к стене овощного магазина, мы стояли. Скамеек на остановке года два как нет. Их нет и на противоположной стороне улицы, где останавливаются трамваи, идущие со стороны Площади Я.Коласа и где скапливается немало посетителей поликлиники, в основном людей преклонного возраста. Кстати, нет скамеек на остановках столичных улиц Красная, проспект Скорины, Дзмитрока Бядули, парк М.Горького и многих других.

Наконец, показался трамвай 1-го маршрута. Войти в переполненный вагон нам помешали молодые плечистые парни в кожанках. «Отрезали» нас и от двери вагона следующего, 5-го, маршрута. «Пробились» только в пятый трамвай, спустя полчаса. Места, отведенные для инвалидов и пассажиров с малолетними детьми, оказались занятыми раскрашенными девицами. Наши просьбы дать присесть до молодых пассажирок не доходили. Когда же одна их женщин начала стыдить их за невнимание к пожилым, они громко рассмеялись, заявляя: «А может мы беременные». «По виду этого не скажешь, - раздались голоса возмущенных людей. - Да и рановато в 14-16 лет становиться матерями».

На остановке « Политехническая академия» появился контролер. Увидев его, девицы, сбивая с ног пожилых людей, кинулись к выходу.

Подобных случаев хамского отношения к покалеченным войной людям в городском транспорте можно привести много. Я видел, как на остановке у тракторного завода в переднюю дверь ввалилась компания молодых парней. Спешно заняв передние места, они начали потягивать пиво из банок импортого исполнения. Никому из пожилых они не уступили места. А когда один из престарелых с клюшкой попросил об этом, надменно прозвучали слова: «Чего захотел, дед?! Постоишь десяток минут - и ничего с тобой не случится...»

Наблюдал я и примеры иного порядка. Так, водитель 6-го маршрута Ю.Желудов через микрофон призывал пассажиров уступать места инвалидам войны, пожилым людям. В его вагонах 001 и 002 соблюдался порядок. Подобным образом могут и должны поступать другие водители.

Но есть вопросы, касающиеся не только тех, кто сидит в кабине трамвая, автобуса или троллейбуса. Прежде всего, не везде обозначены места для инвалидов и пассажиров с детьми. Кое-где таблички сорваны или замазаны густой краской. А в так называемых пражских вагонах их ни разу не было и нет. Там только надписи: «Мест для сидения -40, для стояния -80» и «За безбилетный проезд - штраф в размере 0,5 минимальной зарплаты».

Много случаев безобразного отношения к инвалидам наблюдал я в троллейбусах 1-го, 2-го, 5-го, 33-го маршрутов, в автобусах 37-го, 60-го, 91-го и некоторых других направлений. Отдельные водители неправильно реагируют на справедливые замечания, грубят пассажирам, в том числе и инвалидам. В автобусах 19-го, 57-го, 38-го и 69-го маршрутов места для престарелых отведены у входной двери на боковом сидении в виде скамейки, расположенной над передним колесом. Это создает большие неудобства: входящие и выходящие наступают на ноги инвалидам, их тревожит тряска во время езды. Еще сложнее положение в пригородных автобусах, прежде всего маршрутов 113, 227, 232 и некоторых других, где пожилым людям приходится ехать десятки километров стоя, опираясь на костыли или клюшки.

Не отличается благосклонностью к инвалидам и минская «подземка». В вагонах не слышно голоса машиниста о необходимости уступить места пожилым людям. А вот в Москве, Санкт-Петербурге, Киеве, Ташкенте это вошло в норму. Надо перенимать лучший опыт.

Вопрос о плохом отношении к инвалидам войны в городском транспорте наша газета поднимала около двух лет назад. Тогда горсовет, трамвайно-троллейбусное управление, руководство метрополитена критику признали объективной и справедливой, но мало что сделали по устранению вскрытых недостатков. А жаль. Нельзя забывать о тех,кто пролил кровь, получил увечья в боях за Родину. Их остается в живых всё меньше. Им требуются постоянное внимание и забота. Они заслужили это, внесли достойный вклад в достижение Победы над фашизмом, 50-летие которой в мае отметит все прогрессивное человечество.

Дмитрий ПИСЛЯКОВ,
член пресс-группы Всебелорусской ассоциации войны

ШТО НАША ЖЫЦЦЁ

ПУСТЭЛЬНІК,

або пра тое, як «дзядзя Вова» стаў лясным насельнікам

...Бальнічны ложак Стропыша - каля самых дзвярэй. Быццам знарок тут яго размясцілі, ведаючы, што ўсё роўна ўцячэ. Завязаць з ім гаворку не проста: на пытанні адказвае толькі словамі «так» ці «не». Дыялогу не атрымліваецца. Калі ён падымаецца і спрабуе хадзіць, з цяжкасцю трымаючыся на адной назе і абапіраючыся на мыліцу, у яго вачах застывае насцярожанасць - прадчуванне, што чакае нейкай крыўды.

А некалі ж быў хлопец - зух. Статны, прыгожы, з гонарам. Для Кацярыны наогул - самым лепшым на свеце. Яна не звяртала ўвагі на плёткі, што, маўляў, любіць Уладзімір заглядваць у чарку. Думала, каханне ад дурной звычкі адвучыць.

Спярша ўсё так і складвалася. На мужа не магла нарадавацца - заўсёды побач. Трымаў у парадку хату, гаспадарнічаў на двары. Добры, уважлівы, усё, што зарабляў, нёс дамоў. І жыць з ім было цікава - заўсёды нешта прыдумляў, планаваў, да нечага імкнуўся. Потым пачалі здарацца зрывы. Усё часцей пачаў адлучацца з дома, прыходзіў нападпітку, а то і зусім п'яным. Пачаў прагульваць, і ў саўгасе, дзе ён рабіў, сталі да яго адносіцца насцярожана. А дома і зусім не было на яго ўправы: калі вып'е, трымайся, замучыць рэўнасцю, прыдзіркамі, скандаламі. Пачаў распускаць і рукі. Бывала, вернецца Кацярына дамоў з кірмаша (яна ездзіла заўсёды ў Маладзечна гандляваць усім, што было ў гаспадарцы) з пустымі рукамі, гэта значыць, без бутэлькі, - усё дома разнясе. І ўрэшце нап'ецца і выштурхне яе за парог...

Але па-сапраўднаму ёй зрабілася страшна, калі аднойчы, вярнуўшыся дамоў, яна не застала ў хаце сыноў. Пабегла іх шукаць і знайшла ў чужым агародзе. Яны сядзелі там і плакалі, галодныя і халодныя. Бацька, калі напіўся, выгнаў іх на холад. Тады яна ўпершыню пачула ад сваіх дзяцей страшныя словы: «Нам такі бацька не трэба...»

Пайшоў ён сам. Спярша перастаў начаваць дома, цягаўся невядома дзе і з кім. У саўгасе яшчэ спрабавалі, як маглі, навесці яго на розум, адарваць ад бутэлькі - і работу знайшлі лепшую, і куток для начлега далі, каб хоць пад наглядам быў. Аднак усе намаганні разбіваліся, як аб глухую сцяну. Стропыш падаўся з дома ў лес, відаць, палічыўшы, што ўжо там яго ніхто не будзе даймаць папрокамі і злымі словамі.

Так пачалося яго пустэльніцкае жыццё. Сплёў сабе курэнь, абклаў яго мохам, саломаю. Пра новае яго «месца жыхарства» хутка даведаліся, і за шалашом замацавалася мянушка: «курэнь дзядзькі Вовы». Пастухова яно стала прытулкам для тутэйшых п'яніц, бамжоў і бадзяг. Давялося ўмяшацца міліцыі.

Так упершыню Уладзімір трапіў на лячэнне. З лякаркі ён збег і зноў зашыўся ў глыбіню лесу.

Кацярына тым часам латала і пераладтвала сваё зламанае жыццё, гадавала сваіх чацвярых дзяцей. Прыгажосцю жыццё яе не абдзяліла, а вось шчасця не дало. Мала таго, што сама нагаравалася ў адзіноцтве, дык яшчэ перадала яго «па спадчыне» сваёй дачцы Веры - тая таксама засталася без мужа з чатырма малымі дзецьмі. Баліць матчына душа і за сына Пятра - ад бацькі яму перадалася звычка выпіць, пайшоў па яго заблытанай, п'янай сцежцы. Хоць добра, што для малодшых - Яраслава і Івана - «прыклад» бацькі стаў урокам: як ад агню, шарахаюцца ад бутэлькі.

З бальніцы Стропыш зноў збег, уцёк далей ад людзей і змайстраваў сабе для начлега новы курэнь - на гэты раз падобны на куратнік. Улетку, калі цёпла, яшчэ сяк-так перабіваўся. Горш было зімою, калі ад марозу не было куды дзецца. Застудзіў нагу, і давялося яе ампутаваць. Цяпер кульгаў на адной, але аб тым, каб кінуць такое жыццё і вярнуцца дамоў, і слухаць не жадаў.

Удзень збіраў парожнія бутэлькі, слоікі, каб купіць хоць піва, а вечарамі разам са сваімі выпадковымі сабутэльнікамі наладжваў сваркі і бойкі. Так і жыў па-сабачы. Суцэльны, без прасвету змрок. Адзіны цёплы агеньчык у гэтым змроку - святло ў вокнах хаты, якую ён з такой радасцю будаваў і некалі абшалёўваў. Хата, на парозе якой некалі сустракалі яго прыгожая маладая жонка і вясёлымі званочкамі звінелі дзіцячыя галасы.

Цяпер жа - чорная мяжа, якая аддзяляе нармальнае жыццё ад жывёльнага стану. У гэтым сэнсе лёс Уладзіміра Стропыша -неардынарны. Ён жа і чалавекам быў неардынарным - усё ў яго ладзілася, спорылася ў руках, жыццё яму ўсміхалася ў твар. Пайшоўшы ў лес ад людзей, ён сам нібы падвёў гэтую рысу, выкрэсліў сябе з жыцця. Вось і думаецца: чаму ён так зрабіў? Пабудаваў хату, звёдаў каханне, стварыў сям'ю, даў жыццё чацвярым дзецям - а затым разбурыў усё, што пабудаваў сваімі рукамі. Зрабіў над сабою нешта падобнае на самазабойства: не пайшоў жа да другой жанчыны ў пошуках лепшага шчасця, -пайшоў ад самога сябе...

М.БУЙНАВЕЦ

ТОРГОВОЕ ОБСЛУЖИВАНИЕ

По существу высказанных претензий...

Из Партизанского района столицы во Всебелорусскую ассоциацию инвалидов войны поступила жалоба. Речь в ней - о недостатках в торговом обслуживании бывших фронтовиков, партизан и подпольщиков. Отсюда и раньше поступали нарекания. В частности, несколько лет назад инвалиды обижались на тесноту помещения, в котором располагался стол заказов. Тогда по настоянию Минской городской АИВ для этих целей был выделен магазин N 28.

Однако и на новом месте выявились серьезные упущения, о которых сообщалось в средствах массовой информации, в том числе и в «Нашей доле». Руководители райпищеторга и районного Совета народных депутатов критику признали и сообщили о мерах по устранению вскрытых недочетов. Но вот, полтора года спустя, поступила новая жалоба.

Вместе с секретарем торговой комиссии ВАИВ М.П.Павленко направляемся в магазин N 28. Там к нам присоединились активисты городской ассоциации инвалидов войны В.Е.Ващенко и М.Ф.Рухлевич, занимающиеся вопросами торговли.

-- На обслуживании в этом продовольственном магазине, - поясняет Михаил Федорович, - состоит около семисот инвалидов. А всего получают продовольственные заказы не менее шести тысяч льготников, среди которых блокадники Ленинграда, чернобыльцы, престарелые, инвалиды с детства и по зрению, многодетные семьи.

Главное внимание уделяется участникам войны. Для их обслуживания отведено два дня в неделю.

В один из таких дней мы и прибыли сюда. Перемены, происшедшие за полтора года, очевидны: помещение отремонтировано, приведено в порядок, вдоль стен торгового зала - полумягкие стулья и скамейки, на которых можно присесть передохнуть. Переоборудованы прилавки. Кассовые аппараты из отдаленных углов перенесены к торговым местам. Оформлен информационный стенд. На одном из его щитов сообщается, какие товары сегодня в продаже, их стоимость, нормы отпуска. Перемены к лучшему произошли в фасовочной, холодильных камерах.

Однако недостатки остаются, их немало. Мы увидели и услышали от покупателей многое из того, что вызывает у них недовольство и обеспокоенность, т.е. то, что отражено и в жалобе.

С девяти утра в торговый зал начали заходить инвалиды. Очередь увеличивалась быстро, но продвигалась медленно из-за того, что работала лишь одна касса. У двух других прилавков продавцы и кассиры появились через час с лишним спустя -- и то после нашего вмешательства.

-- Подобное случается у нас частенько, - говорит 80-летний инвалид ВОВ 2-й группы А.П.Тиханович. - Это вызывает у людей нервозность. В магазине отсутствуют надписи о том, что покалеченные войной люди обслуживаются в первую очередь.

В разговор вступает одногодок Алексея Прохоровича инвалид 1-й группы И.И.Гогочевский, участвовавший в освобождении Минска, получивший в боях два тяжелых ранения и контузию, награжденный орденами Отечественной войны 1 степени, Красной Звезды, медалью «За отвагу».

-- С побитыми ногами и травмой головы, - говорит Иосиф Иванович, - мне тяжело стоять в очередях, поэтому редко бываю в магазине. Но приходится -- остался один. Помощи ждать не от кого. Жизнью таких, как я, ни райсобес, ни военкомат не интересуются.

Людей,подобных Гогочевскому и Тихановичу, можно и нужно обслуживать без очереди. Заведующая магазином Фаина Скуратович в нашем присутствии дала указание продавцам на этот счет. Пообещала, что и сама, и ее заместитель Елена Почкай будут чаще заглядывать в торговый зал.

Заботу и внимание к искалеченным на фронтах и в партизанских отрядах людям надо проявлять постоянно, а не только после напоминаний. Было бы полезным вывесить на видных местах надписи о том, что инвалиды войны, лично прибывшие за продовольственным заказом, обслуживаются в первую очередь.

Кому-кому, а Фаине Михайловне эта исина должна быть известна. Свыше двадцати лет работает она в системе торговли. Два с лишним года в Афганистане заведовала магазином военторга. В одном из гарнизонов неподалеку от Кабула о ней шла добрая слава. За хорошее обслуживание воинов-интернационалистов ее наградили медалью «За трудовую доблесть». Накопленный опыт, знания и навыки следует шире применять в нынешних условиях.

Инвалиды войны И.А.Курмашев, М.М.Придбург, М.П.Лазарева, Е.А.Тихоненко говорили мне об отсутствии в продаже молочных продуктов. Длительное время не поступают в магазин творог, кефир, ряженка, сметана, сливки. А почему? Из-за отсутствия холодильных прилавков. Их пока два в наличии: один -- для мясных, второй - для колбасных изделий. Открытому акционерному обществу «Постторг» и его генеральному директору С.А.Смольскому надо быстрее выделить магазину N28 еще два холодильных прилавка. Тогда можно в достатке завозить крайне необходимые пожилым людям молочные продукты.

Авторы жалобы, многие покупатели, в том числе инвалиды ВОВ С.Ф.Дедков, А.И.Уткин и его жена Мария Терентьевна, Ф.Л.Памов и другие высказали недовольство непрерывно растущими ценами на продукты питания. К сожалению, это действительно так.Жизнь становится все дороже. Получаемые невысокие пенсии не позволяют инвалидам в достатке приобретать даже крайне необходимое продовольствие.

Торговые наценки в столах и магазинах заказов ниже обычных на 5-15 процентов, но только на колбасные и мясные изделия. Положительную роль тут могли бы сыграть прямые поставки, однако они практикуются пока еще редко. Главными поставщиками по-прежнему остаются городские базы и предприятия через торготделы, посредничество которых обходится дороговато. Вот пример.

Накануне нашего посещения в магазин N 28 завезли свежие сосиски, колбасы из Глубокского и Поставского районов. Разница в цене оказалась ощутимой. Так, сосиски стоили на 9 тыс. руб. дешевле доставляемых с минского мясоперерабатывающего завода, колбаса полукопченая - на 7,2 тыс.руб., колбаса вареная - на 6 тыс.руб, колбаса ливерная - на 3 тыс. рублей дешевле. Райпищеторгам, торгово-производственным фирмам, акционерным обществам, обеспечивающим столы и магазины заказов для инвалидов, необходимо расширять прямые поставки продовольственных продуктов. А значит, нашим покупателям можно будет приобретать свежие добротные товары подешевле.

Подтвердился изложенный в жалобе факт продолжающейся продажи в штучном отделе спиртных напитков. На это инвалиды не раз обращали внимание завмага Ф.Скуратович и руководства «Постторга», однако они пока не реагируют на справедливые замечания. В магазин за водкой и вином идут люди в грязной одежде, небритые и неряшливые. Некоторые из них тут же распивают приобретенное спиртное. С подобным ненормальным положением мириться нельзя.

Почти все, с кем довелось встречаться, высказывали справедливые претензии к руководителю районной ассоциации инвалидов войны В.М.Абметко и председателю торговой комиссии С.К.Кучинскому, которые, по существу, самоустранились от этого важнейшего участка работы, а их бездеятельность отрицательно сказывается на торговом обслуживании льготников.

Дмитрий ПИСЛЯКОВ,
член пресс-группы ВАИВ

Мікола Капыловіч

НАЧНЫ МЭР

(Нататкі вартаўніка)

Выхаваў

Ля ўваходу ў чыгуначны вакзал стаялі насупраць адзін аднаго двое: малады хлопец і пажылы сяржант міліцыі. Хлопец быў апрануты ў джынсавы касцюм, міліцыянер - у паношаны шынель. Адзін трымаў у руцэ новенькі «дыпламат», другі - старую гумавую палку.

Малады хлопец быў пад чаркай і блытанымі словамі «выхоўваў» міліцыянера:

-- Ну і выгляд у цябе, сяржант! Хіба можна ў такім абмундзіраванні паказвацца на людзях? З людзьмі ж працуеш, а не з нейкай там жывёлай. Ты, як ахоўнік парадку, павінен і ў адзенні прыклад паказваць.

-- Дапусцім, - ні то згадзіўся з хлопцам міліцыянер, ні то падумаў, што той жартуе.

-- Так запускаць сябе не трэба, -- працягваў свой маналог хлопец. - Зірні на сябе хоць раз у люстра... Адзін жах! Шынель на табе, быццам ты ў ім недзе пад плотам качаўся ці заліваў брагу ў самагонны апарат... А чаравікі! Яны ніколі ваксы не нюхалі.

-- Перастань! -- павысіў голас міліцыянер і паварушыў у руцэ гумавую палку.

-- Гэта ты перастань у такой вопратцы людзей смяшыць! У чысцейшай калгаснай даглядчыкі жывёлы на ферму ходзяць. Няўжо не сорамна табе і твайму начальству за твой выгляд?

-- Ты маё начальства не чапай! -- ужо грозна прытупнуў нагою сяржант.

-- Дык гэта ж яно дапусціла, каб ты так хадзіў! Няўжо чысцейшай і больш новай формы яно табе не знайшло? Ай-яй-яй! Да чаго яно дакацілася! Адна срамата!

Міліцыянер пасля гэтых, на яго думку, справядлівых і параканаўчых слоў на хвіліну супакоіўся, перастаў хлопца пагражаць. І гэта надало падпіўшаму яшчэ большую смеласць. Ён спярша пакрытыкаваў неадпрасаваныя штаны сяржанта, потым перакінуў позірк на гумавую палку:

-- Ну і гума ў цябе, сяржант! Парэпаная, патрэсканая... На гнілым шнурку ад чаравіка целяпаецца. Ты хоць змазваў яе чымнебудзь. Хоць салямі, але змазвай, каб не рассохлася і не рассыпалася. З такой гумай нават у свінапасы сорамна наймацца.

-- На свінню яна і ...

Сяржант не дагаварыў і завучаным прыёмам адкінуў хлопца з такой сілай ад сябе, што той крутнуўся на месцы вінтом і падставіў міліцыянеру сваю джынсавую спіну. Якраз гэты момант і падлавіў сяржант і некалькі разоў агрэў гумаю хлопца паміж лапатак. Той сагнуўся і завохкаў ад болю. І ў гэты ж час да «крытыка» падкаціў «варанок». З яго выскачылі два шустрыя малады міліцыянеры, запіхнулі хлопца ў заднія дзверцы міліцэйскай машыны і павезлі.

А крытыкуемы сяржант смачна зацягнуўся цыгарэтаю і патупаў на перон.

МЫ ТАКІЯ РОЗНЫЯ

Творчасць - шлях да сябе

...У пэўнай ступені кватэра Веры Нікадзімаўны Дзехцярэнка нагадвае музейную выставу прыкладнога мастацтва. Паўсюдна –шкатулкі, куфэркі, кубкі, пано, інкруставаныя саломкай. Але сапраўднай жамчужынай сярод усяго гэтага хараства выглядае звычайная шафа для адзення, што масава выраблялася ў пасляваенны час. Толькі дзякуючы таленту гаспадыні, яе мужа, дзетак, яна стала творам мастацтва. Інкруставаная залатой саломкай, яна перадае багацце фантазіі аўтараў, іх узнёсласць. Прычым роскід малюнкаў, асобных дэталяў адлюстроўваюць менавіта наш беларускі каларыт. Гэта бачна ў стылізаваных кветачках, арнаменце.

«Прадстаўлены» тут і ўзоры разьбы па дрэву, косці, вырабы з рога. Па шчырасці кажучы, гэта не самае лепшае, што выраблена таленавітымі рукамі сям'і Дзехцярэнкаў. Найбольш удалыя творы даўно ўпрыгожылі многія музеі Масквы, Мінска, Гомеля, Жлобіна, знайшлі «прапіску» у каталогах выстаў, шэрагу кніг па пытаннях мастацтва. А зазірнуў я да нашай славутай зямлячкі з нагоды саракагоддзя з дня з'яўлення гэтага промысла ў Жлобіне. І звязана гэта падзея менавіта з яе жыццём і творчасцю.

З маладосці ў памяць Веры Нікадзімаўны ўрэзаліся больш за ўсё падзеі часоў вайны. Тады яна, як і ўсе дзяўчаты перадваеннага часу, была ахоплена ідэямі абароны Айчыны. Паступіла і паспяхова вучылася на курсах тэлеграфістак. Гэтага падалося мала, і Вера дабіваецца, каб яе прынялі на курсы медыцынскіх сясцёр. Але дзявочыя планы і мары перакрэсліла полымя вайны. Ёй не давялося трапіць на фронт, але зведаць ліха ад «новага нямецкага парадку» яна змагла удосталь. Перанесла і допыты ў паліцыі, і жахі бамбардзіровак, і рэйды карнікаў. Тым не менш настойліва шукала сувязей з партызанамі і нечым паспела ім дапамагчы. Праўда, сёння, калі мінула столькі год, крыўдуе на сябе, што ў свой час не «узброілася» адпаведнымі даведкамі, «паперкамі», якія б пацвердзілі яе ўдзел у вызваленчым руху, а цяпер далі б якія-ніякія льготы.

...Як толькі тутэйшая зямля была вызвалена ад фашысцкай погані,пачалося аднаўленне народнай гаспадаркі. Напачатку Вера ўладкавалася на торфабрыкетны завод (на пасёлках якога яна знаходзілася пад час вайны), а потым па прапанове земаддзела працуе рахункаводам у мясцовым калгасе «Чырвоная зорка». Справы ладзіліся, ды і вяскоўцы заўважылі яе старраннасць, чуласць да людзей, спагадлівасць, за што і абралі дэпутатам Лукскага сельсавета. Але «прыжыцца» тут не паспела, бо знайшліся згубленыя ў віхуры вайны бацька і маці. Была і больш важкая прычына «уцёкаў» з Лукаў у Жлобін. Цяжкапараненым з фронта вярнуўся каханы, Міхась. Бацькі благаславілі саюз, пажадаўшы маладой сям'і заможнасці і шчасця. У тую пасляваенную бядноту гэтага можна было дасягнуць толькі шляхам заўзятай працы, самаахвяравання.

Маладыя ўзялі дзяржаўную пазыку, набылі лесу, і дах над галавой хутка «вымаляваўся». Пайшлі дзеткі, што прымусіла завесці хатнюю жывёлу, птушку. І ўсё ж на жыццё не хапала. Аднойчы бацькаў родзіч прывёз інкруставаную перламутрам запальніцу. Яе прыгажосць зачаравала кабету, і вось неяк, гадуючы парсюка, Вера ўбачыла залаты бляск саломы. Здавалася , усё жыццё на яе дзівілася, а не заўважала такой натуральнай прыгажосці. Развважаючы над нечакана заўважаным хараством, яна прыйшла да думкі: а што, калі аздобіць якую-небудзь рэч стужкай саломкі, абавязкова ўтварыўшы малюнак, завершаную кампазіцыю. Трэба сказаць, ідэя трапіла на добрую глебу. Муж, мастак ад прыроды і з багатымі ўяўленнямі чалавек (выкладаў пэўны час маляванне ў школе), горача падтрымаў задуму. Пачаліся натхнёныя, хаця, часам, і пакутлівыя, пошукі крыніц мастацтва. Вынайсці нешта з літаратуры не ўдалося. Пачалі самі эксперыментаваць, рабіць і перарабляць. З усіх варыянтаў клею найбольш прыдатным аказаўся сталярны. Першай «прадукцыяй» былі рамачкі для фотаздымкаў, якія ў той час былі неад'емным атрыбутам пакою ў любой сям'і. Здаецца, і выглядалі яны няблага, але ж нечага не хапала. Вырашылі шукаць падказкі ў народнай творчасці. З такім намерам прыдбалі фотаапарат «Бесса» і паехалі па бліжэйшых і аддаленых вёсках. Прасілі гаспадынь прадэманстраваць самаробныя рушнікі, спадніцы, блузкі. Цікава вышытыя дэталі адзення ці рэчаў фатаграфавалі, а потым дома старанна вывучалі і пераносілі малюнак на свае вырабы. І саломка «зайграла», ажыла, увасобленая ў цікавых сюжэтах, хітраспляценнях узору.

Дапаможны промысел пакрысе стаў папаўняць сямейны бюджэт. Лягчэй стала гадаваць і чатырох дзетак, што хутка падрасталі. І вось аднойчы дом наведалі афіцыйныя асобы. Ад нечаканасці Вера Нікадзімаўна крыху нават збянтэжылася. Але госці прынеслі добрую вестку, якая, як потым аказалася, паўплывала на ўсё далейшае жыццё. А завіталі да іх работнікі аддзела культуры райвыканкама з просьбай прадставіць свае работы на выставу. Прыемна было, што заўважылі. Але ж і боязна заяўляць аб сабе як мастаку і ўмельцу на мерапрыемстве агульнараённага маштабу. На шчасце, глядач высока ацаніў прадстаўленыя работы. Гэта і паспрыяла таму, што аб таленавітай сям'і са Жлобіна дазналіся і ў Гомелі, і ў Мінску.

Між тым слава аб умельцах «дастукалася» нейкім чынам і да міністэрскіх кабінетаў. Там вырашылі скарыстаць таленты на карысць і дзяржаве. І вось ужо ў Жлобін прыязджае работнік міністэрства мясцовай прамысловасці таварыш Багдановіч з прапановай паставіць справу на прамысловыя рэйкі.

Цяжкай была гэтая размова для абодвух бакоў. Сталічнаму ўпраўленцу здавалася, чаго тут баяцца: драўніна ёсць, саломы навалам, навучы і пасадзі побач колькі памочнікаў і «штампуй» шкатулкі, кубкі і г.д. Інакш глядзелі на гэтую справу Дзехцярэнкі. Міхаіл Васільевіч пакутваў ад цяжкіх раненняў. Ні ў дзень, ні ў ночы вайна не адпускала яго, нагадваючы фізічнымі мучэннямі і нялёгкімі ўспамінамі. Веры Нікадзімаўне падавалася, што арганізоўваць цэх - зусім не жаночая справа. Тым не менш, дамоўленасць была дасягнута, і 25 студзеня 1955 года В.Н.Дзехцярэнка была прызначана начальнікам цэха інкрустацыі.

– Цэха, уласна кажучы, напачатку і не было, – узгадвае яна. - Проста нас абодвух «прымацавалі» да Гомельскай арцелі «18 партз'езд», якая займалася мастацкай вышыўкай. Але паступова пачаў складвацца калектыў. Я набрала шэсць чалавек, якія павінны былі асвоіць прафесіі столяра, грунтоўшчыка, лакіроўшчыка, інкрустатараў...

Першыя шкатулкі рабілі з тарнай дошчачкі, што, вядома, не дазваляла вырабіць рэч высокай пробы. Таму ў хуткім часе наладзілі дастаўку дошчачкі з Бабруйскай мэблевай фабрыкі. А там і памяшканне для цэху падшукалі – ля старой лазні захаваўся (ацалеў у полымі вайны!) невялікі дом. Паспрабавалі працаваць у ім, але спецыялісты прызналі будынак аварыйным, таму неўзабаве мусілі перасяліцца (узялі ў арэнду) у дом па вул. Шашыйнай. На той час у цэху працавала ўжо трыццаць чалавек. Было цеснавата, таму прыдбалі яшчэ адзін домік паблізу цяперашняй СШ N 5. Праўда, многім новае рамяство аказалася непадуладным, не атрымлівалася - і ўсё табе! На першы погляд простая праца патрабавала цярпення, натхнення, багацця ўяўленняў. Хто такімі якасцямі не валодаў, пакідаў занятак.

Цяжэй за ўсіх, бяспрэчна, было арганізатару. На жаночыя плечы раптам абваліліся клопаты па здабычы матэрыялаў, разліку заробкаў. А колькі жахлівых думак навальвалася на яе кожны раз, калі везла зарплату з Гомеля ў Жлобін – час быў не менш неспакойны, чым цяпер.

Паступова справы пайшлі на лад. Пра жлобінскіх інкрустатараў загаварылі па ўсёй рэспубліцы. Гандаль з задавальненнем набываў усю выробленую прадукцыю. Але, як нярэдка бывае, знайшліся зайздроснікі. Гомельскія кіраўнікі вырашылі перавесці прыбытковую справу ў абласны цэнтр, папярэдне праслаўшы ў Жлобін аднаго стажора. Крыўдна было такое зразумець: як-ніяк, «з нуля» пачыналі, адладзілі справу, навучылі людзей і на табе – зварочвай «фірму». З такімі намерамі чыноўнікаў Вера Нікадзімаўна не пагадзілася. «Клубок спрэчак» дакаціўся да сталіцы. Адбылася нарада, якая канчаткова вырашыла лёс цэху на карысць Жлобіна. Тады было прынята і рашэнне аб будаўніцтве новага цэха, які і стаў падмуркам для будучай фабрыкі.

Што ж пераважыла ў той даўняй спрэчцы? Дзехцярэнка лічыць, што набыты на той час вопыт работы, прызнанне таленту самадзейных мастакоў і інкрустатараў прафесійнымі творцамі. А яшчэ - яе аргументаваныя доказы, смеласць і непахіснасць. Усё гэта і пакарыла сэрца міністра і яго калег.

Напачатку 60-х у горадзе ўжо дзейнічала фабрыка мастацкай інкрустацыі. Вера Нікадзімаўна ўступіла «кіраўніцкае крэсла» мужчынам, а сама з захапленнем занялася любімай справай. Цяпер з'явіўся час для творчых пошукаў, эксперыментаў.

– Памятаю, – расказвае яна, – як аднойчы нас, групу адпачываючых у адным з санаторыяў Кіславодска, прывезлі на экскурсію на мясцовую фабрыку мастацкіх вырабаў. Больш за ўсё ўразіла работа са звычайным каровіным рогам. У руках майстроў нараджаліся цудоўныя рэчы - ад упрыгожванняў хатняга інтэр'еру да розных сувеніраў. А чаму б і нам не паспрабаваць... Словам, загарэлася і як апантаная узялася за новую справу.

Усё, на дзіва многіх, у яе атрымлівалася. Яна з поспехам асвоіла новыя для сябе прафесіі разьбяра па касці і дрэву і ўзгаданае ўжо рамяство - спецыяліста па вырабу сувеніраў з рога. Дарэчы, у рабоце з рогам жлобінскія майстрыцы пайшлі далей закаўказскіх – асвоілі выпуск падставак пад гадзіннікі, кашпо, падсвечнікаў, нават падвесак, брошак, кулонаў, якія карысталіся попытам у модніц.

... Да лютага 1979 года працавала В.Н.Дзехцярэнка на роднай фабрыцы. Напрыканцы бурлівай працоўнай біяграфіі яна ўжо больш займалася вучобай маладых паслядоўнікаў яе справы. Была бракёрам, майстрам інкрустацыі. А сама ўжо не магла спаборнічаць у спрыце і адухатварэнні з пакаленнем, якое прыйшло на змену ветэранам. Але гэта яе не прыгнечвала, не раздражняла, не выклікала хваравітай рэўнасці. Наадварот, яна радавалася, што распачатае ёй у Жлобіне рамяство цяпер ужо ніколі не загіне.

Зараз Вера Нікадзімаўна жыве больш сваімі ўспамінамі...

– Лічу, не дарэмна пражыла гэтыя гады, - тлумачыць яна. - У творчасці, якая сілкавалася з жыватворных крыніц народнага таленту, знайшла я сэнс свайго жыцця. Хіба гэта не можа падтрымліваць духоўна зараз, даваць сілы, узнёсласць.

М.КАЗЛОЎ

Фота А.Шайнова

ХОЧАЦЕ - ВЕРЦЕ...

Узніклі цяжкасці: муж кідае

За справу бярэцца ўсемагутны маг!

У мяне ў сям'і склалася вельмі цяжкая сітуацыя: муж пасля васьмі гадоў сумеснага жыцця вырашыў мяне і двух нашых дзяцей кінуць. Я ўжо ўсё паспрабавала: і ўгаворвала, і пагражала, нават на работу да мужа хадзіла. Ды ўсім цяпер напляваць! Выпадкова знаёмыя параілі звярнуцца да бабкі-чараўніцы, маўляў, яна зможа тваго мужыка да сям'і прывязаць. Паслухалася я парады: пайшла да бабкі. Доўга яна ўслых мацюгалася ды нешта ціха шаптала. А потым сказала: «Калі месячныя да цябе прыйдуць, збяры крыху крыві ды ў чай свайму мужыку падмяшай! Навекі твой стане!»

І што вы думаеце? Дапамагло!!! Муж раптам дурныя думкі кінуў, нашы адносіны быццам бы самі сабой наладжвацца пачалі... Я цяпер у чараўнікоў паверыла, хоць іншы раз думаю, не можа такога быць...

Ірына, 29 гадоў.

Наш субяседнік - Юрый ЛОНГА, папулярны магістр практычнай магіі, народны лекар, член Міжнароднай асацыяцыі магаў і чараўнікоў.

– Юрый, вы маг чорны ці белы?

– Белы. Як кажуць дзеці, «добры чарадзей». Аднак я знаёмы і з тайнамі чорнай магіі. Бо свайго праціўніка трэба ведаць у твар! Прычым я - не тэарэтык, я - практык. І карыстаюся вельмі многімі метадамі народнай магіі. Гэта ж наша спадчына, на жаль, амаль забытая і зняважаная...

– Юрый, усё-такі спосаб, які параіла бабка-чараўніца нашай чытачцы, сапраўды дапамог.

– Але ж у пісьме пра гэта сказана зусім ясна! Гэты спосаб даволі папулярны, і да яго звяртаецца мноства жанчын.

– Значыцца, можна ім карыстацца?

– А вось гэтага я не параіў бы нікому. Падобныя метады - з арсенала чорнай магіі. Мужчына ў гэтых выпадках аказваецца пад уздзеяннем чорных сіл, нічога добрага ў гэтым няма!

– Чаму ж нічога добрага? Многія жанчыны хочуць любымі спосабамі «прывязаць» да сябе мужа на ўсё жыццё! Якая ім розніца - чорная ці белая магія дапаможа?!

– Добра, адкрыю вам невялікую тайну: зачараваць на ўсё жыццё нельга! Інакш чалавек страціў бы сваю асобу, індывідуальнасць, залежаў бы ад іншых людзей. Ён стаў бы некім накшталт «зомбі», якія існуюць толькі ў фантастычных раманах. Зачараваць з дапамогай магіі можна толькі на нейкі тэрмін. Потым чалавек вяртаецца назад, да сябе самога. І вось калі ён вярнуўся ад «сіл зла», дык сітуацыя стане ў сто разоў горш за тую, што была да чараўніцтва. Паколькі дзеянне яго скончылася, але абуджаны «д'ябал унутры»...

Так што з дапамогай чорнай магіі вяртаць мужа не рэкамендую. Але ёсць праверанныя стагоддзямі народныя спосабы, скажам так, больш мяккага ўздзеяння.

Я, напрыклад,у падобных выпадках карыстаюся бытавой, практычнай, вясковай магіяй: прывароржваю на месяц-два, не больш. Няхай муж вернецца за гэты час у сям'ю, а потым муж і жонка самі разбяруцца, ці варта ім жыць разам.

– Дык не кожны ж можа звярнуцца непасрэдна да вас - прафесіянала ў сваёй справе! Давайце дадзім некалькі практычных, як вы гаворыце, «бытавых» парад нашым чытачкам, у якіх «муж загуляў».

– Што ж... Вазьміце лаўровы лісцік. Сканцэнтруйцеся, трымаючы яго на руцэ. Нашапчыце на гэты лісцік замову на каханне:

«Как люди смотрятся в зеркало, так бы муж смотрел на жену да не насмотрелся; а мыло, сколь борзо смоется, столь бы скоро муж полюбил; а рубашка, какова на теле бела, столь бы муж был светел».

Потым непрыкметна зашыйце гэты лаўровы лісцік у падкладку пінжака ці штаноў мужа...

Другі спосаб: вазьміце фатаграфіі жонкі і мужа, складзіце твар да твару, перавяжыце белай ніткай, на вузельчык капніце воск ад царкоўнай свечкі і на тыдзень пакладзіце ў зацішнае месца...

Ці такі спосаб. Жонка бярэ шклянку з вадой, ставіць на левую руку. Правай рукой трэба вадзіць па краёчку шклянкі па гадзіннікавай стрэлцы, чытаючы замову на каханне і называючы імя свайго мужа. Потым шклянка павінна ўсю ноч прастаяць на акне. А раніцай, калі жонка будзе гатаваць мужу чай, няхай капне ў заварку 2-3 кроплі гэтай вады. Падаючы чай, жонка павінна глядзець мужчыну ў левае вока ці ў пераноссе... Гэта дзейсны метад. Муж пасля такой магіі жонку яшчэ больш кахаць будзе!

– А калі адваротная сітуацыя: мужу трэба жонку вярнуць да сям'і?

– Гэтыя метады таксама прыдатныя. Можна прапанаваць яшчэ і такі: няхай муж абрэжа ў сябе з галавы пасмачку валасоў і падсыпле іх жонцы ў абутак ці пакладзе ў кішэню яе адзення...

– Юрый, мы доўгі час былі «заўзятымі матэрыялістамі», таму цяжка паверыць у тое, пра што вы гаворыце. Ці ёсць нейкае ўсяму тлумачэнне?

– Справа ў тым, што акрамя нашых звычайных спосабаў зносінаў ёсць зусім іншага роду сувязь. Нашы думкі ў нейкім родзе матэрыяльныя, і энергетычная сувязь паміж людзьмі ідзе пастаянна праз так званы банк касмічнай інфармацыі. Я прывяду прыклад і паспрабую растлумачыць, дзякуючы чаму такі спосаб спрацоўвае. Але падкрэслю: гэта толькі маё меркаванне.

Пазнаёміліся вы, скажам, з дзяўчынай, запрасілі да сябе, папілі кавы... І цяпер вельмі вам хочацца, каб яна прыйшла яшчэ раз. Запомніце, па якой траекторыі яна ішла па кватэры, і потым падмяціце венікам у савок яе сляды. Савок і венік пастаўце ў кут у прыхожай ці на кухні, і няхай яны там стаяць тыдзень. Вось убачыце: дзяўчына пра вас успомніць і ёй захочацца вярнуцца.

Гэта стары спосаб «чараў на сляды». Магчыма, механізм дзеяння такі: вы ж самі ўвесь тыдзень ходзіце міма саўка з венікам і думаеце пра гэтага чалавека. Вашы думкі перадаюцца яму праз банк касмічнай інфармацыі, і ўрэшце рэшт у аб'екта вашых дум з'явіцца незразумелае для яго жаданне вас убачыць ці хоць бы пазваніць.

– Але, напэўна, можна думаць пра дзяўчыну і без веніка?

– Уся магія пабудавана на вобразах. Параўнаю з гіпнозам: колькі б вы ні паўтаралі «спаць, спаць, спаць...», нічога не адбудзецца. Гіпнацізёр заўсёды дзейнічае праз вобразы тыпу: «рукі цяплеюць» ці «ўявіце сябе на беразе мора...» Вось тады эфект ёсць. І вы можаце хадзіць па кватэры і думаць: «Люся, Люся, Люся...» Аднак ніхто не прыйдзе. Патрэбны вобразы.

– Дзякуй, Юрый, за размову. Мы так доўга з вамі размаўлялі,што дома жонка скандал мне ўчыніць...

– А я дам параду, як змякчыць спрэчку, не даць ёй разрасціся.

Вазьміце кавалак поўсці сабакі ці кошкі,скруціце ў агульны клубок і спаліце на полымі свечкі. Попел закруціце ў анучку і пакладзіце пад ложак. Такім чынам вы быццам бы спальваеце будучы скандал.

Яшчэ адна рэкамендацыя для тых, хто хоча захаваць мір у сям'і.

Вы чакаеце гасцей. Ці вядома вам,што некаторыя людзі, можа, самі таго не ведаючы, прыносяць у чужы дом чорную энергію? Дапамагчы тут павінна галінка святаянніку, што вісіць у спальні і ў прыхожай. Гэтая чароўная трава добра ачышчае ад чорнай энергіі...

– Дзякуй Юрый. Абавязкова паспрабую ўсё гэта зрабіць.

– Жадаю вам з жонкай і вашым чытачам не спрачацца.

«В свободный вечер».

Станислав Говорухин

БОЛЬШАЯ ПРОХИНДИАДА «ГЕНЕРАЛА ДИМЫ»

Заметки кинорежиссера о телесериале на государственном телевидении

(Окончание. Начало в N8 за 23 февраля 1995г.)

Мне скажут: это, мол, оперативные данные, а не официальные документы. Ну что же, такая трактовка, конечно, соответствует закону. Но как быть, если вверху делают все, чтобы не допустить даже малейшей проверки полученных снизу данных? Чего может стоить любая, самая кропотливая работа наших сыщиков по Якубовскому, если государственную пирамиду обвинения возглавляет сегодня Ильюшенко?

В газетах прямо пишут, что Ильюшенко, как и два других знаменитых борца с коррупцией (Макаров и Котенков), летал в командировки к Якубовскому за кордон на деньги последнего, т.е. ел и пил за счет Димы. И привез знаменитый «трастовый договор», с помощью которого подловато был оговорен Руцкой. А теперь тот же Ильюшенко еще и посылает, причет за госвалюту, подчиненных ему следователей прокуратуры в Канаду - расчищать по сути самим созданную помойку. Его допрашивать надо, очные ставки с Димой проводить, а после ареста последнего еще и выяснять: были ли у них контакты в последнее время и какой характер эти контакты носили? А вместо этого Ильюшенко у нас в стране высший прокурорский надзор осуществляет.

Ну а если касаться официальных документов, то в ноябре 1993 г. министру юстиции - генеральному прокурору Канады Пьеру Блэ за подписью Казанника было отправлено письмо (N 18/123569 - 93), из которого я позволю себе несколько цитат:

«Гражданин России Якубовский Дмитрий Олегович, 1963 г.рождения, и его родной брат, гражданин Израиля - Станислав Якубовский, 1967 г.р., в 1992 г. на островах Сент-Винсент и Гренадины зарегистрировали оффшорные фирмы и под предлогом поставки в Москву и Московскую область детского питания и иных товаров получили по контрактам от правительства Москвы и администрации Московской области 31,5 млн. долларов...

... в действиях братьев Якубовских усматриваются признаки преступления, предусмотренного ст. 93-1 УК РФ (хищение госимущества в особо крупных размерах путем мошенничества). В деле имеются сведения о том, что на полученные из России по этим контрактам средства Дмитрий Якубовский приобрел в Канаде и оформил на себя, своих родственников и своих знакомых: Шаповалова, Романюху, Папсуева - недвижимость на сумму около 10 млн. долларов.

В связи с расследованием уголовного дела прошу вас оказать правовую помощь в проведении следственных действий на территории Канады».

Далее в письме Генеральный прокурор России просит сообщить: имеют ли Якубовский и его родные в городах Торонто и Ричмонд Хилл в собственности недвижимость и какую именно? Просит ответить, кто в период 1991 - 1993 гг. являлся собственником домов в провинции Онтарио: г. Ричмонд Хилл, Валдрик Роулд, 418 и 53 Портгейт кросент; в муниципалитете Ричмонд Хилл, Стратерн авеню, 154 и 216 и другие. А также квартиры в Торонто—Антибес Драйв, 135, и Норт-Йорке - Торреседейл авеню, 10, кв. 1807.

Просит также установить, в каких нотариальных или других уполномоченных на это официальных органах Канады регистрировались сделки в отношении указанной в письме недвижимости, и дать в распоряжение российского следствия копии этих документов...

Но почему проекты этих договоров никто не видел даже в первом измерении? Почему не шевелятся министры юстиции, иностранных дел? Почему президентская команда, в отличие от Думы, имеющая огромный аппарат, всевозможные специализированные научные центры и даже внеконституционное ГПУ, до сих пор ничего не делает, чтобы наконец пресечь деятельность так называемых «новых русских», ногами стоящих за кордоном, а руками выгребающих наше добро из России?

Думаю, ответ напрашивается. Да потому, что высшие наши государственные чины сами со своими родственниками стоят в такой же позе. И она им очень нравится...

Возвращаясь к Якубовскому, особо подчеркну роль его братца Станислава. Этот еще более юный умелец все последние годы идет с Димой в одной связке, выполняя функции казначея. То есть схема для нынешних времен была весьма банальна. Правовое оформление сделок идет через фирмы «Стасика», а в основе договоренностей и левых расчетов - Дима с его связями и возможностями в верхних эшелонах российской власти. Он же «рекомендует» фирмы брата для контрактов российским партнерам. Поймать - практически невозможно, особенно если учесть, что Запад не помогал и не будет помогать России ловить воров, утаскивающих к ним наши ценности. Учтем также, что «Стасику» оформили зарубежное гражданство. И именно этот юноша был встречающим и сопровождающим всех нужных людей из России и их жен.

Иногда на вопрос о том, откуда у него миллионы, Дима ссылался не на «помощь» брата, а на жену Марину Краснер, которую некоторые телеведущие ласково именуют «девушкой Машей». Скромная медсестра, точнее зубной техник, но нам внушают, что она известная фотомодель. Агентства, на которые эта «модель» работала, естественно, не сообщаются, чтобы нельзя было поинтересоваться: сколько же она-то заработала за свою пламенную трудовую жизнь?

Год назад Якубовский триумфально вернулся в Москву и начал искать себе место. Однако вскоре обнаружил, что заслуги в борьбе с Руцким не дали ему должных дивидендов. Больше того, некоторые бывшие друзья вдруг начали дистанцироваться от него. Но Дима не унывал. Он был принят в одну из коллегий адвокатов и сразу возглавил консультацию. Тут же началась реклама новоявленного мэтра по всем каналам телевидения. Из Димы стали делать адвоката N 1 демократической России.

Его консультация снимает шестой этаж гостиницы «Метрополь». По словам пресс-секретаря Димы, оплата составляет примерно 1000 долларов в день, то есть около 30 000 долларов в месяц. Зададимся вопросом: есть ли другой адвокат в мире, пусть даже не начинающий, который мог бы арендовать под рабочее место помещения в супершикарнейшем столичном отеле? В офисе у Якубовского трудится немалый штат сотрудников великого оратора, а вход охраняет милиция. Кроме того, в распоряжении мэтра - и роскошная дача в поселке Жуковка. В фильме, кстати, походя оболгали бывшего председателя КГБ Крючкова, заявив, что эта дача предназначалась для него. На самом деле это служебная дача КГБ и использовалась по строгому назначению - для приема и проживания иностранных гостей КГБ.

Разъезжает Дима в шестидверном «кадиллаке», охрана перемещается в чуть менее престижных иномарках. Точное количество охранников Димы мне неизвестно, но поверим «Комсомольской правде», написавшей, что их штату позавидует иной президент. Это еще десятки тысяч долларов в месяц. Замечу, что, на мой взгляд, этим автоматчикам самое место на чеченской войне, где вместо них воюют плохо обученные пацаны...

Наглядевшись на начинающего адвоката, журналисты, естественно, не могут успокоиться и все спрашивают его: откуда деньги? Неужели все брательник подкармливает? И в последнее время Дима несколько видоизменил свои ответы об источниках доходов. Оказывается, возможность так жить-поживать ему обеспечивают банки, которые он консультирует. Назвал он два таких - «Мост» и «Столичный». О руководителях этих банков можно думать что угодно. Но ведь только идиот может платить «семимесячному» адвокату десятки тысяч долларов. Да и какие консультации может дать Дима этим банкам, в которых работают мощнейшие специализированные юридические службы, укомплектованные лучшими российскими специалистами? А о проведенных Димой делах в судах и арбитражах в интересах каких-либо банков вообще ничего слышно не было. В чем же дело? Ларчик открывается несложно, надо лишь читать прессу. Сообщается, что клиентом Димы является Московское региональное управление по борьбе с организованной преступностью. Как утверждает «Независимая газета», расчет с Димой это грозное управление осуществляет, «но не деньгами, а информацией». В фильме и того больше. Сообщают, что Дима заключил договор, по которому будет проводить юридические консультации для сотрудников МВД (?!). В случае необходимости наш альтруист будет осуществлять и бесплатную адвокатскую защиту. «Сейчас, как никогда, правоохранительные органы нуждаются в квалифицированной юридической помощи», - наставительно вещают за кадром.

Образчик Диминой консультации мы лицезреем в фильме. Кто-то из руководителей то ли МВД, то ли Московского ГУВД согнал для Димы в зал сотни сотрудников, и Дима их консультирует. Его спрашивают, что делать, когда задерживают человека с оружием, а у него с собой - заранее подготовленное заявление в милицию о том, что якобы несет это оружие сдавать. Мэтр разъясняет: «Не надо мудрствовать... тут вопрос не правовой... когда ловите с заявлением - разорвали заявление, и вот весь вопрос». Зал изумленно шумит: «Он же потом в суде об этом заявит?..» А Дима в ответ: «А вы скажете - да что вы, товарищ? Какое заявление я у вас порвал?» Да... возникает лишь один вопрос: где этому научился сам Дима - в Союзе адвокатов или в прокуратуре?Но главное здесь, конечно, не где тебя учили -свинья грязи найдет везде. Главное - это то, что в МВД есть руководители, готовые дать трибуну для подобных разъяснений. В любом другом нормальном государстве после таких телекадров было бы назначено служебное расследование, и толкачи такого консультанта тут же слетели бы с должностей.

Запуск Димы на «орбиту», несравненно более мощный, осуществили Кобец и Шумейко. Кобец в начале 1992 года лично извлек Якубовского из Цюриха и включил этого великого военспеца в свою команду, работавшую в то время над подготовкой военной реформы. А весной 1992 года ценного кадра взял к себе вице-премьер Шумейко. Тут талант Димы упал, очевидно, на самую благодатную почву, так как уже через несколько месяцев, 21.07.92, Диме было присвоено звание полковника (!). Не случайно лишь в адрес Кобеца и Шумейко, не считая, конечно, Ельцина, высказывается Дима положительно в телеэксклюзиве. Все остальные его бывшие друзья, то ли подлинные, то ли мнимые, обгажены.

Не очень понятной осталась для меня роль Лукьянова в фильме. Дима, по Лукьянову, - «нормальный парень», «положительное (?) детище российской контрреволюции». В тени Димы, оказывается, «сумели скрыться Шумейко и Руцкой»... Чудеса, да и только! Руцкой поставлен в один ряд с Шумейко. Употреблять, опять-таки в одном ряду с Димой, понятие «патриот», да еще сейчас, в 1995 г., - это что-то невероятное. Впрочем, по монтажу кадров видно, что Лукьянов «дается» не полностью, а вырванным из контекста.

Полтора года назад я закончил фильм «Великая криминальная революция». Это тоже телесериал (три серии, предназначенные для показа по телевидению в течение трех вечеров). О многом мне хотелось предупредить миллионы телезрителей: о том, что идет, практически завершается криминальная революция в стране и она на глазах превращается в уголовно-мафиозное государство; о том, что у нас уже нет армии (не надо было дожидаться чеченской войны, чтобы понять это), мы беззащитны перед внешним врагом, и наши потенциальные противники знают это и делают выводы: о том, как гибнут дети, как калечатся их души, как опытные хирурги-идеологи пытаются вынуть из них духовный стержень, превратить их в племя рабов, как великая духовная страна превращается в нищую неграмотную колонию...

О многом хотелось предупредить: ведь предупрежден - значит, вооружен. Но не получилось. Телевизионный экран сегодня наглухо закрыт для любого слова правды. Все вернулось на круги своя - с чего начали, тем и закончили. Была у нас в кинематографе «полка», на которую клались и крепко запирались от зрителя некоторые картины. И «полка» вернулась. «Великая криминальная революция» - первый фильм, спрятанный от зрителя по политическим соображениям. Между прочим, в ругаемое нами время коммунистов все мои фильмы (вспомним «Так жить нельзя») пулей вылетали на экраны кинотеатров и на телеэкран.

А вот для сериала о Якубовском нашлись и время, и деньги. Государственная телекомпания «Останкино», которая постоянно требует увеличить выделяемые ей бюджетные средства, закупила эту белиберду, то есть оплатила фильм деньгами, вынутыми из наших с вами карманов.

Не лучшее ли это подтверждение того, что криминальная революция завершилась.

МЕЖДУ ТЕМ...

Как рассказал нашему корреспонденту Маршал Советского Союза Д.Язов, к нему в свое время действительно обращался Д.Якубовский с ходатайством от коллегии адвокатов, которая просила включить «подателя сего» в комиссию по защите собственности нашего государства за рубежом. С согласия министра обороны СССР Д.Якубовский в частном порядке воспользовался военно-транспортным самолетом, доставлявшим в Германию почту. При этом командировочные «адвокату» не выплачивались, на довольствие он не ставился и поручений не получал. В дальнейшем пронырливый «защитник собственности» не был включен в комиссию Министерства внешнеэкономических связей, занимавшуюся реализацией зарубежного имущества страны. Д.Язов опроверг распространяемые с подачи «генерала Димы» сведения, будто дал ему какой-то карт-бланш.

По сообщению еженедельника «АиФ», президенту телекомпании «Останкино» академику А.Яковлеву звонили и просили не пускать фильм на экран. Но бывший идеолог КПСС рассудил: раз деньги «уплочены», надо показать эту рекламную «чернушку» народу.

РЭЗАНАНС

«Няма адкуль чакаць дапамогі»

К такому вываду ў сваім жыцці прыйшоў даведзены да адчаю галечай інвалід 2-й групы Мікалай Таўрэль з вёскі Глаўсевічы Слонімскага раёна, які жыве разам са састарэлай хворай маці. Яго зварот «да добрых» людзей за дапамогай быў надрукаваны ў пятым нумары «Нашай долі» за 2 лютага пад рубрыкай «Крыўда».

Аказваецца, дарэмна скардзіцца на дрэннае жыццё Мікалай Таўрэль. Гэты аптымістычны вывад зрабілі намеснік старшыні Слонімскага райвыканкама А.М.Тарсуноў, інструктар раённага таварыства інвалідаў У.А.Семянік і старшыня Дзеравянчыцкага сельскага Савета Н.А.Пякарскі, якія даслалі ў рэдакцыю адказ наступнага зместу:

«На артыкул «Няма адкуль чакаць дапамогі», надрукаваны ў «Нашай долі» за 2 лютага 1995 г., Слонімскі выканаўчы камітэт паведамляе, што сапраўды ў вёсцы Глаўсевічы ў адной хаце жывуць разам Мікалай Таўрэль, яго маці і брат Уладзімір. Гэтую сям'ю даўно ўсе ведаюць.

Маці - Таўрэль Н.Л. 1904 года нараджэння, мае працоўны стаж 5 гадоў 3 месяцы 10 дзён, па пасведчанні аб нараджэнні траіх дзяцей ёй дабаўлена стажу 6 гадоў 8 месяцаў 29 дзён. Такім чынам, яе працоўны стаж склаў 12 гадоў 9 дзён. У студзені 1995 г. яна атрымоўвала 45 тыс. 420 руб. пенсіі, 15 тысяч надбаўкі за догляд па дасягненні 80-гадовага ўзросту і 50 тысяч рублёў дапамогі ў сувязі з падаражаннем прадуктаў харчавання. Усяго ж -- 110 тыс. 420 руб.

Сын, Мікалай, 1938 года нараджэння, працоўнага стажу не мае, з'яўляецца інвалідам 2-й групы з дыягназам шызафрэнія. Атрымлівае сацыяльную пенсію 18 тыс.130 руб. і 50 тысяч кампенсацыі, усяго - 68130 рублёў.

Другі сын, Уладзімір, 1953 года нараджэння, мае працоўнага стажу 18 гадоў 3 месяцы 20 дзён. Атрымліваў пенсію ў студзені ў памеры 87138 руб. Да таго ж ён працуе ў магазіне апальшчыкам і зарабіў за мінулы месяц 60 тысяч рублёў. Усяго атрымаў 147 тыс. 138 руб. Таксама з'яўляецца інвалідам 2-й групы з дыягназам шызафрэнія.

Сукупны даход усіх трох членаў гэтай сям'і за студзень месяц склаў 325 тыс. 688 рублёў. У снежні райвыканкам выдзеліў ім у якасці грашовай дапамогі 150 тысяч рублёў.Па даходах гэтая сям'я не адносіцца да катэгорыі маламаёмных грамадзян.

У сваю хату Таўрэлі нікога не пускаюць, нават мясцовага фельчара і паштальёна. Усіх сустракаюць на вуліцы, а хату закрываюць на замок. 3 лютага я, інструктар раённага таварыства інвалідаў У.А.Семянік і старшыня мясцовага сельскага Савета Н.А.Пякарскі вырашылі зайсці ў хату да Таўрэляў. У сенях нас сустрэў спушчаны сабака. Узяўшы колы, усё ж патрапілі ў жылы пакой. Уразіла страшная антысанітарыя -- хата была завалена дровамі, смеццем, хламам. Маці ляжала на ложку - яна не ходзіць. За сталом Уладзімір лічыў грошы. Калі мы ў яго запыталіся, што на іх збіраецца купіць, ён адказаў:

-- У магазіне мне гарэлкі не даюць, дык адпраўлю Мікалая.

Мікалай, аўтар пісьма ў газету, ні ў таварыстве інвалідаў, ні ў сельскім Савеце, ні ў райвыканкаме нічога не прасіў. Гаварыў толькі адно, што ім не хапае грошай, а пайсці жыць са сваёй хаты ў нейкае іншае месца яны ніколі не пагадзяцца.

Райвыканкам, райсабес, сельскі Савет заўсёды адказваюць на пісьмы Таўрэляў, 20.12.94 г. адказала ім і газета «Рэспубліка».

Намеснік старшыні Слонімскага выканкама А.М.Тарсуноў.»

Мяркуючы па адказу,прадстаўнікі мясцовай улады песімізма Мікалая Таўрэля з нагоды жабрацкага жыцця не адобрылі.

Па-рознаму можна адносіцца да лістоў, падобных таму, які даслаў нам Мікалай Таўрэль. На жаль, іх прыходзіць у рэдакцыю ўсё больш і больш. Што рабіць з імі? Расследаваць ці адпраўляць па «інстанцыях» - можа і падкіне хто дзесятак тысяч «на беднасць»? Можна, супакоіўшы сумленне тым, «што ўсім не дапаможаш», спісаць іх у архіў (маўляў, калі ўжо дзяржава да галечы давяла, дык хай сама і ратуе). Але мы працягваем верыць. Часам памыляемся - але лепш памыліцца, чым заставацца раўнадушнымі. Такія лісты пішуць у самыя цяжкія мінуты жыцця, і друкуем мы іх, каб не згаслі ў душах людскіх святло, міласэрнасць, надзея.

Жанна ВЛАСАВА

КРЫМІНАЛЬНЫЯ ГІСТОРЫІ

Дзяўчынка нарадзіла хлопчыка... ад роднага бацькі

Маральны стан нашага грамадства такі, што некаторыя яго вынікі могуць прысніцца хіба што ў дурным сне.

Асабліва жахлівыя па сваёй паталогіі выпадкі згвалтавання бацькамі сваіх непаўналетніх дочак. Тры такія крымінальныя справы нядаўна разглядаў Маладзечанскі народны суд.

Справа першая

Пятнаццацігадовая дзяўчынка з вёскі Жарлакі, вучаніца 7-га класа, нарадзіла хлопчыка.

-- Хто ж тата твайго сына? - спыталі ў яе ў радзільным доме.

-- Мой тата, - адказала яна.

-- Хто, хто? - перапыталі акушэркі, не верачы сваім вушам.

-- Мой бацька - бацька майго сына.

Супраць саракагадовага бацькі была ўзбуджана крымінальная справа.

Гэтая сям'я складалася з пяці чалавек. Бацька - калгасны палявод, маці захварэла і не працуе ў калгасе. У хаце на ўсіх сямейнікаў не хапае ложкаў, галыцьба, бруд на сценах і падлозе. Гаспадар сам па сабе спакойны, ураўнаважаны чалавек, гарэлкай не злоўжывае. З 1989 года ён пачаў кожную ноч спаць са сваёй старэйшаю дачкою, бо жонка, нарадзіўшы трэцяе дзіця, адмовілася класціся разам з мужам - не хацела мець больш дзяцей. На сексуальныя дамаганні бацькі дзяўчынка кожны раз адказвала: «Як хочаш, бацька, так і рабі». Усё гэта бачылі і чулі астатнія сямейнікі, але ў адносіны бацькі з дачкою не ўмешваліся.

Тое, што яна чакае дзіця, выявілася толькі на сёмым месяцы цяжарнасці.

Суд пасля доўгіх разваг вынес рашэнне: за згвалтаванне дачкі бацьку прыгаварыць да 8 гадоў пазбаўлення волі... умоўна.

Ён будзе і далей жыць у сваёй сям'і -- гадаваць разам з дачкою свайго сына і ўнука.

Справа другая

42-гадовы жыхар вёскі Мясата Мікалай Ільічоў быў пры сваім розуме, але яго дзеянні ў адносінах да роднай дачкі - падлетка нельга назваць інакш, як вар'яцкімі. На працягу двух гадоў ён, п'яны, некалькі разоў спрабаваў яе згвалціць. Дзяўчынка, калі ёй удавалася вырвацца, уцякала з хаты, начавала дзе давядзецца.

У школе яна вучылася дрэнна, паводзіны яе былі такімі ж.

Але настаўнікі нічога не ведалі пра няшчасце сваёй вучаніцы і спахапіліся толькі тады,калі было позна. М.Ільічоў асуджаны народным судом да 10 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Справа трэцяя

Бяздзетная пара - інвалід другой групы пенсіянер Аляксандр Ксяндзоў і яго жонка Марыя Суднік -- узялі з дзіцячага дома пад сваю апеку шэсць дзяцей: трох хлопчыкаў і трох дзяўчынак. Дзеці-сіроты былі шчаслівыя: нарэшце яны займелі свой дом, бацьку і маці, і адносіліся да прыёмных бацькоў, як і павінна быць, з цеплынёй і ласкай.

Але зусім іншае было ў галаве ў «бацькі». Ён бачыў у дзецях прадмет сваіх сексуальных дамаганняў. Асабліва дасталася дзяўчынкам: стары ман'як з першых дзён пачаў да іх чапляцца і часта дамагаўся свайго.

Следствам устаноўлена шмат выпадкаў разбэшчвання А.Ксяндзовым непаўналетніх дзяцей у абставінах, калі яны не маглі супраціўляцца свайму «бацьку». Аднойчы ён палкаю адлупцаваў дзяўчынку, якая яму адмовіла. Перад судом ён так напалохаў дзяўчынак, што тыя адмовіліся ад сваіх паказанняў, таму з-за недастатковасці доказаў ён быў пазбаўлены волі на 1 год і 6 месяцаў з адбыццём тэрміну ў калоніі агульнага рэжыму.

М.ФАМІЧ,
Маладзечанскі раён

КРОССВОРД

(составил Л.Тумилович, г.п.Глуск)

По горизонтали.

5.Кукла в рост человека для показа одежды. 6.Утренняя женская одежда из легкой ткани. 10.Система украшения сооружения или изделия. 11.Совокупность устройств, предназначенных для передачи информации. 12.Род дома отдыха для отдыхающих на курортах. 15.Нечто несбыточное, неосуществимая мечта. 18.Лиана, плод которой - боб длиной до 1,5 метра. 19.Автор романа «Исполнение желаний». 20.Подлинное имя автора,пишущего под псевдонимом. 21.Разновидность языка, употребляемая ограниченной группой людей. 25.Органическое вещество, необходимое для нормальной жизнедеятельности организма. 26.Начало шахматной партии с жертвой пешки или фигуры. 27.Композитор, автор,музыки к песням «На безымянной высоте», «С чего начинается родина». 31.Искусство приготовления пищи. 33.Длинная распашная верхняя одежда из домотканого сукна. 34.Животный мир. 35.Ударный самозвучащий музыкальный инструмент. 36.Авторитет, влияние.

По вертикали.

1.Период, по истечении которого в одной и той же последовательности вновь повторяются солнечные и лунные затмения. 2.Высшая степень восторга, воодушевления. 3.Рыба, способная передвигаться по суше. 4.Строительный материал, с древности распространенный в безлесных районах. 7.Русский живописец-передвижник, создатель «пейзажа настроения». 8.Древнегреческая эпическая поэма. 9.Герой Отечественной войны 1812 года, писатель и поэт. 13. Женские украшения из недрагоценных камней и металлов. 14.Тип кузова легкового автомобиля. 16.Душистое вещество, применяемое в пищевой и парфюмерной промышленности. 17.Русский путешественник, тверской купец. 22.Город в России, крупный центр текстильной промышленности. 23.Древесное растение, выращенное из черенка. 24.Пушистый налет на чем-либо гниющем, влажном. 28.Славянорусский мифологический персонаж в образе девушки, раздающей цветы. 29.Предпринимательская деятельность. 30.Жидкая лекарственная форма. 32.Утепляющая подкладка для верхней одежды.

ПРОГРАММА МИНСКОГО КАБЕЛЬНОГО ТЕЛЕВИДЕНИЯ с 3 по 10 марта

Пятница, 3 марта
9.30STV 11.15Х/ф «Космический мятеж» (фантастика) 12.45STV 19.25Мультфильмы 19.40Х/ф «Поющие в терновнике» (фильм 3-й) 21.00"Городские часы» 21.15"Семь минут с Христофором» 21.35Х/ф «Кошмар на улице Вязов»-7 (фильм ужасов) 23.25STV

Суббота, 4 марта
9.30STV 11.10Х/ф «Поющие в терновнике» (фильм 3-й) 13.00STV 19.05Мультфильм 19.35Х/ф «Гром в раю»-3 (боевик) 20.55Студия БМ 21.15А.Шварценеггер в новой комедии 23.05STV

Воскресенье, 5 марта
9.30STV 11.10А.Шварценеггер в новой комедии 13.00STV 19.05Мультфильмы 19.20Х/ф «Бетховен-1» (комедия) 20.45"Смейтесь на здоровье» 21.05Х/ф «Поющие в терновнике» (фильм 4-й) 23.45STV

Понедельник, 6 марта
9.30STV 11.15Х/ф «Поющие в терновнике (фильм 4-й) 13.35STV 19.25Мультфильмы 19.40Х/ф «Нат со сдвигом» (комедия) 21.15"Городские часы» 21.30Анонс 21.45Фильм А.Вайды «Без наркоза» 23.35STV

Вторник, 7 марта
9.30STV 11.10Х/ф «Нат со сдвигом» (комедия) 12.45STV 19.25"Горгулин» (Мультфильм) 20.45Студия БМ 21.00Анонс 21.15Аль Пачино в фильме «Путь Карлито» 23.25STV

Среда, 8 марта
9.30STV 11.15"Горгулик» (мультфильм) 12.35STV 19.25Мультфильмы 19.40Х/ф «Маленькие женщины» (мелодрама) 21.40"Городские часы» 21.55Анонс 22.05Р.Гир и Ш.Стоун в фильме «Перекресток» 23.45STV

Четверг, 9 марта
9.30STV 11.10Х/ф «Маленькие женщины» (мелодрама) 13.10STV 13.30Режиссер Матвеева «Судьба» 16.15STV 19.05Приключения Тимми-Зубастика(Мультфильм) 20.35"Кабинет» 20.55Анонс 21.05Х/ф с участием А.Шварценеггера 23.10STV

Пятница, 10 марта
9.30 STV 11.15Фильм с участием А.Шварценеггера 13.20STV 19.25Мультфильмы 19.40Х/ф «Ланселот озерный» (исторический) 21.00"Городские часы» 21.15"Семь минут с «Христофором» 21.35К.Костнер в драме «Война» 23.40STV

8 канал

6 марта, понедельник.
18.00Мультфильм «Галактический экспресс». 18.30Документальный фильм «Земля всегда рядом». 19.00РАДА-информ. 19.15Телесериал «Арбалет». 19.45Муз-парад. 20.00Мультфильм «Том и Джери». 20.15Городские часы. 20.30Полицейский сериал «Крутые виражи». 21.30Студия БМ. 21.45Художественный фильм «Белое,синее,красное», 2 серия. 22.45Foxy music (повтор). 23.45Взгляд из Америки.

7 марта, вторник.
18.00Мультфильм «Галактический экспресс». 18.30Немецкая волна. 19.00ИНТЭКС: Новости. 19.15Телесериал «Арбалет». 19.45Муз-парад. 20.00Мультфильм «Том и Джери». 20.15Welcome to. 20.30Центр «Инвестиционные технологии» представляет телесериал «Горец». 21.30Студия БМ. 21.45Кино России. Художественный фильм «Шкура». 23.15Мир развлечений. 23.45Взгляд из Америки.

8 марта, среда.
18.00Мультфильм «Галактический экспресс». 18.30Немецкая волна. 19.00Телеочерк «Люба» (о народном врачевателе и хорошем человеке). 19.15Телесериал «Арбалет». 19.45Муз-парад. 20.00Мультфильм «Том и Джери». 20.15Городские часы. 20.30Центр «Инвестиционные технологии» представляет телесериал «Горец». 21.30Студия БМ . 21.45Натали. Программа для женщин. 22.15Художественный фильм «Элвис и я», 1 серия. 23.50Взгляд из Америки.

9 марта, четверг.
18.00Мультфильм «Бабар». 18.30Визави. 19.00СОЛТЭК: Новости. 19.15Телесериал «Арбалет». 19.45Муз-парад. 20.00Мультфильм «Том и Джери». 20.30Телесериал «Саломея». 21.30Студия БМ. 21.45К сведению. 22.10Художественный фильм «Элвис и я», 2 серия. 23.45Взгляд из Америки.

10 марта, пятница.
18.00Мультфильм «Бабар». 18.30Мир развлечений. 19.00РАДА-информ. 19.15Телесериал «Арбалет». 19.45Муз-парад. 20.00Мультфильм «Том и Джери». 20.15Городские часы. 20.30Телесериал «Саломея». 21.30Студия БМ. 21.45Время местное. 22.15ООО «Сюзетта» представляет художественный фильм «Жена реаниматора». 23.50Взгляд из Америки.

11 марта, суббота.
15.00Художественный фильм для детей «Следы на снегу». 16.45Проповедник Кеннет Коупленд. 17.15Мультфильм «Бабар». 17.45СОЛТЭК: Спортивная мозаика. 18.15Фирма «Кэдбери» и ММ-4 представляют музыкальную программу. 19.15Мультфильм «Как казаки мушкетерам помогли». 19.45Телесериал «Белое, синее, красное» , 2 серия. 20.30В свете рампы. 20.45Мультфильм «Том и Джери». 21.00Студия БМ. 21.30Семь минут с «Христофором». 21.45Камерные подробности. 21.50Художественный фильм «Река».

12 марта, воскресенье.
